Источник: "Краязнаўчая газета" - 2012-12-27

## На тым тыдні...

**17 снежня** ў Музеі сучаснага выяўленчага мастацтва адбылося **адкрыццё выстаўкі** арт-аб'ектаў і інсталяцыяў з лямцу і святла **«НаПраСьвет»**. Праект дазваляе паіншаму зірнуць на архаічны матэрыял – лямец і традыцыйную тэхналогію – валянне. У выстаўцы і суправаджальных мерапрыемствах прынялі ўдзел беларускія мастакі і майстры: А. Арайс, Л. Дамнянкова, Н. Аджзер, В. Багачова і інш.

Выстаўка працуе да 6 студзеня.

**18 снежня** ў Дзяржаўным музеі гісторыі беларускай літаратуры сумесна з Інстытутам нямецкіх даследаванняў і Беларускім дзяржаўным універсітэтам культуры і мастацтваў зладзілі свята **«Беларуска-нямецкія Каляды»**. У праграме прадставілі беларускі калядны абрад, паспявалі песні, прадэманстравалі калядныя гульні, абмяняліся падарункамі.

**18 снежня** ў Цэнтральнай навуковай бібліятэцы імя Якуба Коласа НАН Беларусі прайшло ўрачыстае мерапрыемства **«Каледайскоп беларускай навукі»**, прысвечанае Году кнігі ў нашай краіне. Яго ўдзельнікамі былі вучоныя НАН Беларусі, творчы калектыў выдавецкага дома «Беларуская навука».

Да святочнага дня падрыхтавалі выстаўку **«Год кнігі Выдавецкага дома "Беларуская навука"»**, на якой прадстаўлена каля 100 навуковых і навукова-папулярных выданняў, што пабачылі свет сёлета.

**18 снежня** ў Нацыянальным гістарычным музеі Рэспублікі Беларусь адкрылася **фотавыстаўка, прысвечаная 100-годдзю з дня нараджэння фатографа**, ваеннага карэспандэнта, заслужанага журналіста Беларусі Аляксандра Дзітлава (1912–2009).

На ёй выкарыстаны матэрыялы з фондаў Нацыянальнага гістарычнага музея, Беларускага дзяржаўнага архіва кінафотафонадакументаў, асабістага архіва дачкі фатографа Вольгі Дзітлавай.

**18 снежня** ў Дзяржаўным літаратурным музеі Янкі Купалы прэзентавалі кнігу **«Янка Купала. "Мне сняцца сны аб Беларусі..." »**,прымеркаваную да 130-годдзя народнага паэта. Кніга выйшла ў серыі «ЖЗЛБ» у выдавецтве «Мастацкая літаратура». Укладальнік – Галіна Шаблінская.

**19 снежня** ў Дзяржаўным музеі гісторыі беларускай літаратуры ў рамках культурна-адукацыйнага праекта «Кніжныя навінкі» адбылася **прэзентацыя кнігі Ірыны Багдановіч «Душа лістападу»**.

У кнізе вершаў – паэтычны роздум аўтара аб сутнасці творчасці і чалавечага быцця ў няпростым і зменлівым часе, аб тых вечных духоўных арыенцірах, якія задаюць высокі нябесны вектар зямному чалавечаму існаванню, аб незгасальных патрыятычных ідэалах, што асвячаюць сувязь чалавека з роднай зямлёй і яе гісторыяй.

**20 снежня** ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі адсвяткавалі **юбілейны вечар, прысвечаны 90-годдзю з дня выхаду ў свет першага нумара часопіса «Полымя»**.

Часопіс – найстарэйшае літаратурна-мастацкае і грамадска-палітычнае выданне нашай краіны, у стварэнні якога непасрэдны ўдзел прымалі народныя песняры Янка Купала і Якуб Колас.

З нагоды юбілею НББ падрыхтавала кніжна-ілюстрацыйную выстаўку **«"Полымя" – этапы творчага станаўлення»**, якая раскрывае змест часопіса з першага нумара 1922 года да апошняга.

**21 снежня** ў Цэнтральнай навуковай бібліятэкі імя Якуба Коласа НАН Беларусі адбылася **прэзентацыя новых выданняў: «Беларуска-рускі слоўнік» (у 3 т.) і «Руска-беларускі слоўнік» (у 3 т.)**.

Слоўнікі падрыхтаваныя НАН Беларусі ў адпаведнасці з Законам Рэспублікі Беларусь «Аб Правілах беларускай арфаграфіі і пунктуацыі».

«Беларуска-рускі слоўнік» пад рэдакцыяй Кандрата Крапівы выйшаў у свет 50 гадоў таму. Выданне 2012 г. максімальна поўна адлюстроўвае сучасны стан лексічнага фонду дзвюх моваў. 10-е выданне «Русско-белорусского словаря» і 4-е выданне «Беларуска-рускага слоўніка» выйшлі пад рэдакцыяй члена-карэспандэнта НАН Беларусі, доктара філалагічных навук А. Лукашанца.

Да імпрэзы супрацоўнікамі бібліятэкі падрыхтаваная выстаўка **«Гісторыя і сучаснасць беларускага мовазнаўства ў выданнях Інстытута мовы і літаратуры імя Якуба Коласа і Янкі Купалы НАН Беларусі»**. Экспазіцыя з фондаў ЦНБ НАН Беларусі ўключае слоўнікі, моўныя атласы, энцыклапедыі, вучэбныя дапаможнікі, даведнікі і іншыя выданні.